Приложение 2
к положению о проведении конкурса фоторабот «Мой университет», посвященного 81-летию со дня основания университета

**КУПАЛАВЕЦ**

Ты прыйдзі са мной сустрэцца,
Моладзь слаўнае зямлі!
Ад чуллівых струнаў сэрца
Песню чыстую пралі!
Узлятай, як вольны вецер,
Думы-мары акрыляй,
На вялікім белым свеце
Шчасця-долі не губляй!
Смелай будзь, імкні наперад!
Крок за крокам - спасцігай
Шлях складаны цераз вернасць
Да Радзімы, нібы ў рай!
Ты прыйдзі... Каб зноў настала
Свята ў Доме, дзе заўжды
Дух Купалы, сам Купала
Ёсць і будзе праз гады...
Завітай у час завейны
Добрым госцем дарагім...
Тут адчуй спакой сямейны...
І, як дар, маю прымі
Песню лётную... Высокі,
Малады ёй голас дай,
Каб імкнулася ў аблокі
Гарадзенскі славіць край!

... Педагог - святая справа!
Хто жыццё ёй прысвяціў,
Той рукой стаў Богу правай -
Многім сэрцы прасвяціў!
...Вось ідзеш знаёмай сцежкай
Кожны дзень, а ведай, тут
Тут, на вуліцы Ажэшкі,
Самы першы інстытут
Для настаўнікаў з'явіўся
У яшчэ саракавым...
Даваенным... Адчыніўся!
Сем выкладчыкаў у ім,
Сто студэнтаў, нават болей!
Каб не знішчыла вайна!
Колькі стратаў, колькі болю...
Абарвалася струна...

Не за кніжкі, не за парты,
Навучэнцам выпаў шлях...
А ў салдаты, у салдаты
На вялікі бой і жах...

... Толькі дух народны, сіла
Не далі сябе скарыць...
Вораг здаўся... Краю мілы!
З весняй музыкай крыніц
Ажывае... Аднаўляе
Урачысты міру гімн...
Інстытут зноў адчыняе
Дзверы вучням дарагім
І Купалаўскім завецца!
Кожны-кожны педагог,
Хто, прыйшоў на пакліч сэрца,
Тут знайсці заўсёды мог
Свой прадмет і накірунак -
Што каму бліжэй, лягчэй -
Ёсць фізмат, літаратурны,
Гістарычны, а яшчэ
моў замежных і хім-біа...
І завочны факультэт...
Педагогі маладыя,
Захавайце свой імпэт,
Творчы! Светлы, бы камета!
Зможам разам утрымаць
Званне Універсітэта!
І з надзеяю прымаць
Выхаванцаў зноў увосень,
Развівацца і сталець!
Каб у восемдзесят восьмым
Стаць Купалаўскім - займець
Гэта зорнае, як неба
Гэта слаўнае ІМЯ!
Нам яго трымацца трэба!
Мы Купалаўцы - сям'я!
Разам блізкія па духу!
Моладзь слаўнае зямлі!
І свайго не спынім руху!

Ў дваццаць першае прыйшлі
У стагоддзе, дзе так многа
Раскрываецца шляхоў!
І да новай перамогі -
Да адкрыццяў, да высноў!
З яркай творчасцю без межаў!
У палёце вольных дум!
І чатыры ўжо каледжы
Пад апекай ГрДУ!
Якасць - ключ да перамогі!

І навукі дактары,
І дацэнты, педагогі
Ведаў шчодрыя дары,
Прысвячаць студэнтам рады,
Справу годную тварыць!

...І адзнакаю Урада
Ушанаванымі быць
І сустрэчай з Прэзідэнтам!
Залатым асеннім днём
Для выдатнікаў-студэнтаў
Ўсіх вышэйшых устаноў
У святочнай НАШАЙ зале
З хваляваннем, з цеплынёй
Прэзідэнта мы віталі
Ўсёй Купалаўскай сям'ёй!

... Хай звініць, ліецца-ўецца
Песняй дзіўнай стужка дзён,
Пакладзі далонь на сэрца -
І пачуеш струнаў звон...
А Пясняр падыме вока
Ўгору, гляне на цябе...
Ты ляці, ляці высока!
І захоўвай у сабе
Слова Роднае... Жывое...
Вернасці нясі вянец
І гарачае любові...
Бо імя тваё - КУПАЛАВЕЦ!

Вікторыя Смолка